Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

ГАЛОЎНАЕ КІРАЎНІЦТВА
АДЗІНАЙ ГІДРАМЕТЭАРАЛАГІЧНАЙ СЛУЖБЫ
пры НКЗ БССР

ДЭКАДНЫ БЮЛЕТЭНЬ ПАГОДЫ

Адрас рэдакцыі: Менск, Карла Маркса, 48, Галоўнае
Кіраўніцтва АГМС БССР

№ 21 (101)	21—31 ліпеня	1935 г.

ЗМЕСТ

Агляд надвор'я за дэкаду з 21 па 31 ліпеня—35 г.

У пачатку гэтай дэкады тэрыторыя БССР была занята ахалоджаным кантынентальна- палярным паветрам (былым марскім). Гэтае паветра адыходзіла да поўначы, а ў тыл яму з заходу насоўвалася больш халоднае былое марское палярнае паветра і апошняе 22-га ліпеня канчаткова заняла ўсю тэрыторыю БССР. У звязку са зменай адзначаных паветраных мас і праходжанню халоднага паветранага падзелу, які рухаўся на ўсход праз тэрыторыю БССР назіраліся ў першую палову сутак ападкі, месцамі з навальніцамі. Марское палярнае паветра паступова рухалася на поўнач і паўночны ўсход ператвараючыся ў кантынентальна палярнае, а з заходу і паўночнага заходу прадаўжала насоўвацца свежае марское паветра.

Пачынаючы з канца сутак 23 ліпеня з поўдня на поўнач рухалася вобласць нізкага ціску (цыклон). Гэта вобласць рухалася вельмі слаба і ўся тэрыторыя БССР знаходзілася ў цыкланічнай дзейнасці. Складаючыя паветраныя масы, адзначанай вобласці:—у пярэдняй частцы — (паўночнай) — былое марское і палярнае паветра, у тылавой (паўднёвай)—цёплае кантынентальна палярнае паветра (былое трапічнае). Акрамя гэтага над

Табліца вынікаў метэаралагічных назіранняў за 21—31 ліпеня 1935 г.

Назва станцый	Тэмпература паветра																Адносная вільготн. паветра за 13 г. у %	Тэмпература на паверхні глебы			Ападкі ў мм												Метэаралагічныя з'явы (у дужках адзначаны числы).
	21	22	23	24	25	26	27	28	29	30	31	Сярэдняя	Нармальн.	Максімальная	Мінімальная	Чысло, калі нагляд. мінімум		Максімал.	Мінімальн.	Чысло, калі нагляд. мінімум	21	22	23	24	25	26	27	28	29	30	31	Сума	
Дрыса	18	15	15	18	18	14	16	13	14	13	15	15	—	24	6	21	66	—	7	21	5.0	0.3	..	..	3.0	4.0	2.0	10.0	3.0	5.0	..	32.3	туман (21)
Полацк	18	15	16	17	17	14	14	14	14	14	17	16	18	22	9	21	70	—	—	—	1.0	2.0	..	..	7.0	10.0	0.6	9.0	9.0	5.0	..	43.6	туман (24)
Гарадок	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
Нова-Каралёва	19	15	15	18	17	14	13	14	13	13	15	15	17	23	8	21	65	36	6	23	5.0	..	..	13.0	9.0	29.0	2.0	8.0	12 0	4.0	0.5	82.5	лівень (25)
Лепель	18	15	16	17	16	15	16	14	13	13	16	15	—	22	7	23	66	—	10	23	3.0	0.9	..	..	6.0	0.2	1.0	7.0	7.0	5.0	3.0	33.1	—
Плешчаніцы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	..	..	1.0	..	..	1 0	11.0	7.0	10.0	12.0	2.0	44.0	—
Бобр	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
Барысаў	18	16	15	16	17	15	16	14	14	12	15	16	18	23	7	23	63	—	7	23	2.0	..	..	0.1	8.0	0.1	2.0	6.0	4.0	12.0	2.0	36.2	туман (21, 24)
Менск	18	14	14	17	17	14	15	13	13	12	14	15	18	22	6	23	64	—	—	—	1.0	..	..	..	7.0	0.3	0.3	5.0	6.0	5.0	1.0	25.6	—
Бярэзіна	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
Мар'іна-Горка	18	15	14	17	18	14	15	14	14	13	14	15	18	22	8	23	65	—	7	23	8.0	..	..	0.6	19.0	..	0.3	2.0	1.0	3.0	0.2	34.1	—
Асіпавічы	20	16	15	17	17	14	16	15	15	14	14	16	18	24	8	23	62	—	—	—	10.0	..	..	3.0	22.0	..	0.1	0.6	4.0	1.0	0.1	46.8	бура (29)
Орша	19	16	16	17	17	14	15	14	13	12	14	15	18	23	9	21	72	—	7	22	8.0	..	..	10.0	20.0	5.0	..	5.0	8.0	10.0	0.3	66.3	—
Горкі	19	16	16	18	17	14	14	14	14	13	13	15	18	23	8	23	73	37	8	24	2.0	..	0.1	19.0	60.0	15 0	1.0	4.0	4.0	6.0	0.4	111.5	лівень (24, 25) граза (25)
Клічаў	—	—		—		—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
Слуцк	18	15	14	16	17	14	15	16	13	13	14	15	—	23	8	23	67	—	8	24	8.0	..	..	10.0	6.0	0.3	..	4.0	2.0	0.9	..	31.2	туман (21)
Мар.-Сосны	18	14	14	16	15	15	16	15	14	13	14	15	19	24	7	23	68	37	2	23	10.0	..	..	44.0	12.0	3.0	..	9.0	2.0	..	..	80.0	граза (21) туман (23, 24)
Магілеў	20	16	16	16	17	·15	16	15	15	14	—	16	18	24	8	23	74	—	—	—	5.0	..	2.0	16.0	46.0	0.5	..	4.0	2.0	1.0	0.1	76.6	граза (22, 24, 25)
Чавусы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
Чэрыкаў	20	17	18	19	19	14	16	14	15	14	14	16	18	24	10	23	66	—	—	—	0.5	..	1.0	0.5	64.0	5.0	0.1	4.0	3.0	..	..	78.1	граза (25)
Касцюковічы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
Турск	20	16	16	17	18	15	16	15	15	14	14	16	19	24	8	23	67	40	9	31	0.4	..	0.5	22.0	127.0	5.0	1.0	4.0	1.0	..	..	160.5	лівень (24, 25)
Жлобін	20	17	17	17	17	15	16	15	15	14	14	18	19	24	9	23	66	—	—	—	2.0	..	1.0	35.0	40.0	6.0	2.0	3.0	1.0	..	.	90.0	граза (24, 25) бура (29)
Жыткавічы	18	15	14	16	16	15	16	16	15	14	14	16	—	25	8	23	65	—	—	—	6.0	..	..	18.0	9.0	1 0	—	8.0	3.0	..	..	45.0	—
Калінкавічы	20	16	15	16	16	15	17	16	16	15	14	16	19	25	8	23	68	—	—	—	..	..	19.0	29.0	82.0	4.0	..	2.0	5.0	..	..	141.0	град (24) граза (24, 25)
Лельчыцы	20	17	14	16	17	16	18	16	16	.15	14	18	—	—	—	—	69	—	—	—	1.0	..	1.0	13.0	2.0	4.0	..	2.0	4.0	0.1	..	27.1	граза (24)
Чэчэрск	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	0.2	..	2.0	1.0	18.0	9.0	1.0	3.0	2.0	..	..	36.2	граза (24, 25)
Барба	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
Гомель	21	18	19	19	17	15	17	16	17	15	15	17	19	25	10	26	64	—	10	25	0.1	..	2.0	3.0	9.0	6.0	..	1.0	4.0	..	..	25.0	граза (24)
Васілевічы	20	16	17	16	16	14	16	16	16	15	14	16	19	25	8	23	75	36	8	24	1.0	..	31.0	99.0	47.0	2.0	..	2.0	10.0	..	..	192.0	граза (4) лівень (25) град (25)
Камарына	20	18	18	18	16	14	17	17	17	17	16	17	19	26	11	31	61	—	—	—	3.0	0.1	4.0	1.0	10.0	3.0	0.1	1.0	4.0	..	..	26.2	лівень (25)

Табліца вынікаў метэаралаг. назіранняў за 21—31 ліпеня 1935 г.

Назва станцый	Вецер: Пераважаючы: Напрамак	Вецер: Пераважаючы: Хуткасць	Вецер: З максім. хуткасцю: Напрамак	Вецер: З максім. хуткасцю: Хуткасць	Інсаляцыя у %%	Сярэдняя воблачнасць у 10-бялавай сістэме: Агульная	Сярэдняя воблачнасць у 10-бялавай сістэме: Ніжняя	Сярэдні стан паверхоўага пласта глебы (на глыб. 10—15 см)
Дрыса	NW	7	NW	9	—	9	8	вільготны
Полацк	W	4	W	6	—	8	8	мокры
Гарадок	—	—	—	—	—	—	—	—
Нова-Каралёва	SW	4	W	12	—	8	8	мокры
Лепель	SW	4	S	6	—	8	5	вільготны
Плешчаніцы	—	—	—	—	—	—	—	—
Бобр	—	—	—	—	—	—	—	—
Барысаў	SW	4	SW	12	—	8	5	вільготны
Менск	W	7	NW	12	—	8	5	—
Бярэзіна	—	—	—	—	—	—	—	—
Мар'іна-Горка	SW	6	W	12	—	8	6	—
Асіпавічы	S	4	W	9	—	8	5	вільготны
Орша	SW	5	W	10	--	8	6	вільготны
Горкі	SW	4	W	9	34	8	5	мокры
Клічаў	—	—	—	—	—	—	—	—
Слуцк	SW	6	SW	17	—	8	8	мокры
Мар'іна-Сосны	W	4	W	12	—	8	5	вільготны
Магілеў	SW	4	SW	12	—	10	9	вільготны
Чавусы	—	—	—	—	—	—	—	—
Чэрыкаў	SW	6	W	14	—	8	5	вільготны
Касцюковічы	—	—	—	—	—	—	—	—
Турск	SW	6	SW	12	30	8	8	вільготны
Жлобін	SW	6	SW	14	—	9	8	вільготны
Жыткавічы	W	4	W	7	—	8	6	—
Калінкавічы	W	4	SW	12	—	9	5	мокры
Лельчыцы	W	4	W	7	—	9	8	вільготны
Чэчэрск	—	—	—	—	—	—	—	мокры
Барба	—	—	—	—	—	—	—	—
Гомель	SW	4	SW	10	—	8	—	вільготны
Васілевічы	SW	4	SW	9	—	9	9	вільготны
Камарыно	SW	4	SW	12	—	8	5	вільготны

захадам Еўропы распалагалася вобласць высокага ціску (антыцыклон), па перыферыі якой рухалася халоднае марское палярнае паветра, захапляючы ўсю тэрыторыю БССР. Разам з гэтым праходзілі халодныя паветранныя падзелы, дзякуючы чаму з 24-га па 30 ліпеня стаяла выключна дажджлівае надвор'е, месцамі з навальніцамі і ліўнямі (асабліва ў паўднёвых раёнах БССР).

Халоднае марское палярнае паветра, якое ў папярэдні перыяд занімала тэрыторыю БССР—з 30-га ліпеня пачала праграявацца, у звязку з чым дзённыя тэмпературы з гэтага часу і да канца дэкады, павышаліся, у параўнанні з сярэднімі данымі мінулага перыяда гэтай дэкады. Невялікія ападкі назіраліся пераважна ў паўночных раёнах БССР.

Наогул на працягу ўсей апошняй дэкады бягучага месяца, тэрыторыя БССР далучалася да вобласці нізкага ціску з дажджлівым надвор'ем. Колькасць выпадзеных ападкаў за суткі ў паасобных раёнах значна правышала шматгадовыя даныя за цэлы месяц.

Д. Захарык.

Метэаралагічная характарыстыка к табліцы вынікаў мет. назіранняў з 21 па 31 ліпеня.

Сярэдняя сутачная тэмпература гэтай дэкады на поўначы, захадзе і ўсходзе раўнялася 15-16^0, а на поўдні 16-17^0. У паасобныя дні—сярэдняя сутачная тэмпература адхілялася ад сярэдняй за дэкаду на 2^0—4^0, максімальная тэмпература за дэкаду даходзіла да 22^0-23^0 на поўначы і захадзе, 23^0-24^0 у цэнтральных раёнах і на ўсходзе і 25^0-26^0 на поўдні, а мінімальная зніжалася да 8^0-9^0. У параўнанні з шматгадовай сярэдняй—тэмпература гэтай дэкады была ніжэй на 2^0-3^0. Надвор'е гэтай дэкады было пераважна пахмурнае і дажджлівае. Агульнае пакрыццё неба воблакамі ў сярэднім 80—90%. Па ніжняй воблачнасці—ступень пакрыцця змянялася ад 50% і да 90%. Лік гадзін магчымага за 11 дзён дэкады сонечнага з'яння (Горкі, Турск),—даходзіў 30—34%. Кожная станцыя адзначыла ад 7 да 9 дзён з дажджом. Не было ападкаў па ўсёй тэрыторыі (за выключэннем значных ападкаў на некаторых пунктах поўначы) толькі 22-га, на паўночнай палове 23-га і на паўднёвай палове апошнія два дні дэкады. Рад станцый, пераважна на ўсходзе, цэнтры і асабліва на поўдні—адзначае вельмі моцныя дажджы-ліўневога характару. Станцыі Турск—(Рагачоўскі р.)—Васілевічы (Рэчыцкі р.) і Калінкавічы (Мозырскі р.)—адзначылі 24 і 25 ліпеня небывала моцныя ліўні, якія далі ў параўнанні са шматгадовымі дадзенымі—рэкордна вялікія сутачныя колькасці, (Турск 127 мм., Васілевічы —99 мм. Калінкавічы—72 мм. у той час як шматгадовым дадзеным маем для Васілевіч—70 мм. Калінкавіч—57 мм. па Турску шматгадовых дадзеных не маецца). Сума ападкаў за дэкаду па станцыях Васілевічы, Турск, Калінкавічы, Горкі—, значна перавысілі шматгадовую норму за цэлы месяц (шматгадовая сярэдняя месячная сума за ліпень—па Васілевічам—99 мм.,

па Калінкавічам—87 мм. па Горкам—84 мм., па Турску павінна таксама быць блізкай да гэтых лічбаў).

Ліўні 24-га і 25-га суправаджаліся моцнымі грозамі. Калінкавічы і Васілевічы—адзначылі грозы з выпадзеннем града, прычым у Васілевічах—град выпаў у вельмі вялікай колькасці.

Ветры пераважалі паўднёва-заходняга напрамку—значныя (параўнальна) па сіле.

М. Міціна.

Агрометаналіз за 3 дэкаду ліпеня—35 г.

Дзякуючы, штодзённа выпадаўшым ападкам умовы надвор'я гэтай дэкады было неспрыяючым, як для паспявання зернавых культур, так і для ўборкі сена, а ў паасобных цэтральных і паўднёвых раёнах (глядзі лічбовую табліцу і метэаралагічную характарыстыку), дзякуючы моцным ветрам і выпадзенню ападкаў у выглядзе вялікіх ліўняў, месцамі (Калінкавічы, Васілевічы) з градам, нават нанесены пашкоджанні пасеваў.

Становішча с/г. культур наступнае:

Азімае жыта—уборка, ацэнка стану добрая.

Азімая пшаніца—знаходзіцца ў фазе пераважна васковай спеласці. Ацэнка стану добрая і здавальняючая.

Яравая пшаніца—фаза развіцця малочная спеласць у паўночнай палове рэспублікі і васковая спеласць у паўднёвай палове. Ацэнка стану добрая і здавальняючая.

Авёс—Фаза развіцця малочная спеласць у паўночнай палове і васковая спеласць у паўднёвай палове БССР.

Ацэнка стану добрая і здавальняючая.

Ячмень—у паўночнай палове малочная і васковая спеласць, на поўдні ўборка. Ацэнка стану добрая і здавальняючая. Метстанц. Калінкавічы (Мазырскі р.), адзначае, што ў звязку з празмерна вялікай колькасцю ападкаў заўважаецца загніванне бульбы.

З сельска-гаспадарчых работ на працягу дэкады вытвараліся: сенакашэнне, уборка зернавых культур, месцамі малацьба і г. д.

В. Стэфановіч.

Нам. адказнага рэдакт

Друк. БелАН. Заказ № 766. Уп. Галоўліта № 2919